паэтычнай формы – хоку. Вядома падборка трохрадкоўяў у зборніку “Круглы год”, дзе надрукавана дзесяць узораў жанру, якія маюць раскаваную структуру і выразны беларускі каларыт, што дазволіла І. Штэйнеру назваць іх “шніпаўкамі” [1, с. 138]. Нацыянальны дух тут перамагае і передае вобраз у прыватных дэталях: *“утравелыя помнікі-валуны / як рэшткі брукаванай дарогі / па якой прайшло дваццатае стагоддзе”* [2, с. 278].

У ліку версіфікатарскіх эксперыментаў паэта можна назваць цыкл “Мая альфабэта”, дзе з дапамогай гукапісу да кожнай літары алфавіта падаецца разгорнутая асацыяцыя. Падобнае ілюстраванне вядомае еўрапейскай паэзіі. Думаецца, вопыт А. Рэмбо (“Галосныя”) дапамагаў беларускаму мастаку ўявіць палітру магчымасцей паэтычнай асацыяцыі: Ш *“шыпучае як шампанскае / якое п’юць шляхціцы”* [1, с. 269].

Архітэктанічныя копмлексы на аснове акраверша прадстаўлены ў цыкле “Вандроўка ў часе”, які складаецца з дванаццаці акраверлібраў – паводле аўтарскага вызначэння, “асацыятыўных інкрустацый” [1, с. 283], шыфрамі якіх з’яўляюцца назвы месяцаў: *“**Л**уг лашчыцца і лашчыць / **І**ду як імігрырую ў іншасвет / **П**ыл і павуцінне пільнуюць спажыву / **Е**льнік пахне грыбамі / **Н**адвячорак нагадвае што ўсё нявечна / **Ь**…”* [3, с. 285]. У цыкле “Тыдзень без цябе” гэткім самым чынам зашыфраваны назвы сямі дзён тыдня, прычым словы кожнага радка складаюць таўтаграму.

Такім чынам, пошукі В. Шніпа ў галіне вершаванай мініяцюры вядуцца ў трох асноўных накірунках: праз мадыфікацыі традыцыйнай формы (хоку), гукапіс (“альфабэцікі”) і жанравы сінтэз – акраверлібры (“асацыятыўныя інкрустацыі”) і акраверлібры-таўтаграмы.

**Літаратура**

1 Штэйнер, І. Споведзь перад Богам і людзьмі : беларуская паэзія на стыку тысячагоддзяў : манаграфія / І. Штэйнер. – Гомель : КВПУП “Сож”, 2007. – 174 с.

2 Шніп, В. Проза і паэзія агню : вершы, аповесць, эсэ / В. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2010. – 318 с.

3 Шніп, В. Балада камянёў : паэзія і проза / В. Шніп. – Мінск: Маст. літ., 2006. – 318 с.

***В. В. Гончаров***
*Науч. рук.* ***Т. Н. Усольцева,***
*канд. филол. наук, доцент*

## НЕБЕСНОЕ И ДЕМОНИЧЕСКОЕ В РОМАНЕ А. С. ПУШКИНА «КАПИТАНСКАЯ ДОЧКА»

А. С. Пушкин стремился показать в романе «Капитанская дочка» темную и светлую стороны истории. Поэтому важной частью данного произведения становится пласт сакральной символики. Нахождение истины может быть заключено в мифопоэтической образности. Обращение к образу Мирового дерева позволяет моделировать процесс космологической организации художественного пространства.

Вариантом Мирового древа является древо добра и зла, символизирующее центральную ось мира, соединяющую Небо и Землю.

«Мифопоэтическая Модель мира часто предполагает тождество (или, по крайней мере, особую связанность, зависимость) макрокосма и микрокосма, природы и человека» [1], – отмечал В. Н. Топоров. Сложный сплав исторических, реально-бытовых, фольклорных и символических элементов образует в романе «Капитанская дочка» системы признаков, которые позволяют соотнести любой художественный образ с определенным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уровнем древа добра и зла и восстановить параллелизм данного образа с небесным или демоническим началами.

Корни Мирового древа или дерева добра и зла глубоко проникают в подземный (демонический) мир, а его ствол протягивается от Земли к Небу (божественный мир). Таким образом, понятия добра и зла по своему ценностно-императивному содержанию представляют собой две стороны одной медали. Это понятия вечные и неразделимые, они взаимоопределены и в этом равны.

Данная интерпретация объясняет сложность, противоречивость и двойственность образа Пугачева: жестокого и великодушного, лукавого и прямого. Это человек-«оборотень» и великий царь, милосердный спаситель и беспощадный убийца. Образ Пугачева вступает в диалектические отношения с образом Екатерины II. В сопоставлении с универсальным символом Мирового древа (древа добра и зла) данные образы идентифицируются однопорядковыми началами мира (небесным и демоническим), находящимися в постоянном и неустранимом единоборстве.

**Литература**

1 Топоров, В. Н. Модель мира (мифопоэтическая) / В. Н. Топоров // В. Н. Топоров. Мифы народов мира: Энциклопедия. В 2 т. Т. 2. [Электронный ресурс] / – М., 1980. – С.161–166. – Режим доступа: http://philologos.narod.ru/myth/ modelmira.htm – Дата доступа: 15. 04.2013.

***Д. І. Дуброўская***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА ДАВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ Ў СУЧАСНЫХ ФАЛЬКЛОРНЫХ ЗАПІСАХ

У сістэме вясельнай абраднасці Гомельшчыны вылучаюцца тры перыяды: перадвясельны, вясельны і паслявясельны. Перадвясельны перыяд складаецца з наступных кампанентаў: дамоўленасць, пярэпыты, сватанне, запоіны, заручыны (змовіны).

Такія абрадавыя этапы, як дамоўленасць і пярэпыты, на Гомельшчыне сустракаюцца рэдка. Падчас «дамоўленасці» маладыя папярэдне вырашаюць пытанні аб шлюбе, а падчас пярэпыт маці жаніха ацэньвае падвор’е будучай нявесткі і перапытвае, ці згодна яна выйсці замуж. Пасля пярэпытаў прызначаўся дзень сватання. Дадзены абрадавы момант – адна з галоўных частак давясельнага перыяду, калі сваты афіцыйна дамаўляліся аб шлюбе і прызначалі час запоін або заручын.

У сваты звычайна хадзілі ў суботу вечарам, нават ноччу, пры гэтым колькасць удзельнікаў цырымоніі была рознай.

Абрад сватання суправаджаўся рытуальным дыялогам паміж сватамі і бацькамі нявесты. Дзеянні, якія сімвалізавалі ўмову згоды або нязгоды на шлюб, мелі адметную мясцовую спецыфіку («Калі нявеста давала згоду ісці замуж, то яна павінна была перарэзаць хлеб, які прынеслі сваты»* (в. Міхнаўка, Брагінскі р-н)).

Пасля сватання звычайна адбываліся запоіны (заповіны), недзе праз 2 тыдні вечарам у суботу ці ў нядзелю. Звычайна падчас гэтага абрадавага этапа «дзяўчыну як бы «запіваюць» да роду жаніха» (в. Любавічы, Жыткавіцкі р-н).

На заручынах (змовіны або «сугляды») «заручалі нявесту» (в. Дварэц Рагачоўскага р-на). Праходзілі заручыны звычайна за тыдзень перад вяселлем у хаце нявесты, і прысутнічалі звычайна не толькі блізкія родзічы. «Галоўная задача, якая тут вырашалася, – канчаткова дамовіцца аб усіх падрабязнасцях вяселля і пра пасаг» (в. Кругавец, Добрушскі р-н).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ